# УВАСАБЛЕННЕ ФЕНОМЕНА БАГАВАННЯ Ў РАМАНЕ КАТАРЖЫНЫ ТУЧКАВАЙ «ЖЫТКАЎСКІЯ БАГІНІ»

**Л. У. Шаховіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*kazachnik13@gmail.com;*
*навук. кір. – А. У. Вострыкава, канд. філал. навук, дац.*

Работа прысвечаная вывучэнню арыгінальнага ўвасаблення мараўскага феномена багавання ў рамане сучаснай чэшскай пісьменніцы Катаржыны Тучкавай «Жыткаўскія багіні». Аб’ект даследавання – вышэйзгаданы раман, прадмет – багаванне як культурны феномен і яго адлюстраванне ў творы. Актуальнасць даследавання абумоўлена вялікай цікавасцю як чэхаў, так і беларусаў да нацыянальнай ідэнтычнасці і народных традыцый; запатрабаванасцю вывучэння адлюстравання гэтых традыцый у мастацкай літаратуры. Мэта работы – даследаваць феномен багавання і спецыфіку яго ўвасаблення ў азначаным творы. З прычыны таго, што «Жыткаўскія багіні» – дастаткова новы твор маладога аўтара, ён не вывучаны ў дастатковай ступені, у чым заключаецца навізна нашай работы. Вынікі даследавання могуць быць ужытыя пры выкладанні дысцыпліны «Гісторыя чэшскай літаратуры», пры правядзенні спецсемінараў і спецкурсаў, прысвечаных чэшскай літаратуры. Работа можа садзейнічаць папулярызацыі ведаў пра сучасную чэшскую літаратуру і пра славянскія традыцыі.

***Ключавыя словы:*** багаванне; белая магія; прыродная магія; андзелаванне; традыцыі Маравіі; жыткаўскія багіні; Катаржына Тучкава.

Багаванне – гэта ўнікальны культурна-псіхалагічны феномен, які існаваў на землях Маравіі са старажытных часоў. Ён зарадзіўся на мяжы магіі, пантэізму, хрысціянскай рэлігіі і народных традыцый і ўяўляў сабой сістэму пэўных поглядаў на свет і сукупнасць магічных практык, якія цалкам правамерна аднесці да «белай» магіі. Багаванне практыкавалі жанчыны, ад нараджэння надзеленыя пэўным дарам: звышнатуральнымі здольнасцямі. Само слова багаванне мае відавочнае этымалагічнае паходжанне ад лексемы бог: гэта магічная дзейнасць, якая нейкім пэўным чынам звязана з боскім, надзвычайным.

Лакалізацыяй феномена можна назваць вялікую чэшскую вёску Жыткава, што знаходзіцца ў Маравіі, ў Злінскім краі, у Белых Карпатах, на мяжы са Славакіяй. У сувязі з геаграфічным распалажэннем гэты населены пункт яшчэ нядаўна вылучаўся сваёй ізаляванасцю і адрэзанасцю ад знешняга свету. Францішак Барташ так ахарактарызаваў жыхароў Капаніц: «Іх хрысціянства – усяго толькі маска, праз якую прасвечваецца іх сапраўднае аблічча – на дзве трэці яны язычнікі-стараверы. І больш нідзе на Мараве не знойдзем мы столькі разнастайных народных павер’яў, столькі забабонаў і старвх звычак, як у гэтым аддаленым горскім закуцці» [1, с. 12].

Па-мастацку пераасэнсавала феномен багавання ў сваім творы «Жыткаўскія багіні» сучасная чэшская пісьменніца Катаржына Тучкава, чыё майстэрства неаднаразова пацвярджалася шматлікімі літаратурнымі прэміямі, сярод якіх прэстыжная прэмія Ёзэфа Шкворацкага 2012 года за вышэйназваны твор. «Жыткаўскія багіні» – у значнай ступені дакументальны раман, у якім пісьменніца пераследавала мэту паказаць адзінкавасць і непаўторнасць мараўскай культуры, а таксама звярнуцца да лёсаў багінь [2].

Падыход аўтаркі да апісання багавання комплексны: Катаржына Тучкава не абмяжоўваецца павярхоўным паказам азначанай з’явы як пэўнай пісьменніцкай «дэкарацыі», але звяртаецца да сутнасці феномена, разглядаючы яго шматаспектна.

Па-першае, Катаржына Тучкава апісвае багаванне з прагматычнага, найбольш лагічнага пункту погляду – як сукупнасць разнастайных магічных практык. У адлюстраванні гэтых практык у тэксце пісьменніца скрупулёзная і дзейнічае, як даследчыца. Для яе важна не столькі перадаць атмасферу чараўніцтва, колькі тэхнічна апісаць гэты працэс. Сярод шматлікіх магічных і калямагічных практык, якія выкарыстоўвалі багіні і якія згадваюцца ў рамане, можна вылучыць варажбу, прыродную магію, лячэнне. Паасобку стаіць «андзелаванне», якое можна аднесці да дапаможных практык.

Некаторыя багіні абіралі сабе памочнікаў, такзваных «андзелаў» – гэта былі маладыя дзяўчаты ці дзеці, якіх багіні вучылі задаваць кліентам спецыяльныя пытанні. Так як багіні найчасцей жылі на аддаленых хутарах у гарах, прыезджыя рэдка маглі самастойна знайсці да іх дарогу, і звярталіся да “андзелаў” па дапамогу. Задачай такіх праваднікоў было не толькі паказаць кліенту шлях да багіні, але і ненавязліва распытаць яго пра мэту візіта і як мага больш пра яго жыццё. У сваім творы Катаржына Тучкава надае традыцыі знаходзіць такзванага «андзела» («анёла») вялікае значэнне. Каб патлумачыць чытачу месца «андзелавання» ў працэсе багавання, пісьменніца абірае паказаць з’яву знутры, вачыма андзела. Для гэтай мэты Катаржына Тучкава абірае ўспрыманне дзіцяці як найбольш непамутнелае і шчырае. Пісьменніца раскрывае вельмі важную падрабязнасць: важнымі для багінь былі не толькі самі пытанні, але і тое, як «андзелы» задавалі іх і транслюе важную для разумення сутнасці багавання думку – «андзелаванне» не махлярства, але частка працэсу, цяжкая справа, якая патрабуе псіхалагічнай падрыхтоўкі і ведання чалавечай прыроды ад «андзела».

Найбольш шырока ў рамане прадстаўленыя спосабы варажбы. Часцей за ўсё сустракаецца апісанне класічнай практыкі ліцця воску, якой

валодалі ўсе або амаль усе багіні. Для аўтаркі важна паказаць эстэтыку гэтай старажытнай з'явы, яе гіпнатычнае ўздзеянне на чалавека, празорлівасць багінь, моц іх інтуіцыі. Адным з найважнейшых эпізодаў рамана становіцца варажба са зліццём воску для Доры ад Ірмы Габрыгелавай. Аўтарка дэталёва апісвае ўсе неабходныя для варажбы прадметы: маляваная міска з народным арнаментам, у якой у якасці духмянага рэчыва падпальваюцца зёлкі, гаршчок з таксванай крынічнай «шчаснай вадзічкай», воск, які расплаўляўся на пліце да вадкага стану [3, с. 210–211]. Працэс багавання апісаны тэхнічна, скурпулёзна: для пісьменніцы важная кожная дэталь, нават распалажэнне рэчаў на стале.

Сярод практык варажбы ў рамане яскрава апісанае прыварожванне [3, с. 101–102]. Гэта комплексны, складаны абрад, звязаны з канцэптам жаноцкай прывабнасці. Галоўнымі магічнымі атрыбутамі становяцца крынічная вада, зёлкі, цеста, лабковыя валасы і менструальная кроў. Вада – вельмі характэрны элемент багавання, але таксама немагнчыма не адзначыць, што вада ў славянскай міфалогі моцна звязаная з жаночым пачаткам [4, с. 59]. Зёлкі, якімі карыстаенцца Сурмэна, у рамане названыя: гэта святаяннік і дзераза. Святаяннік выкарыстоўваўся для варажбы на шлюб і для таго, каб адвадзіць сурокі і разлучніц [5]. Чырвоныя ягады дзеразы звязаныя з каханнем, як і многія іншыя чырвоныя ягады [5]. Лабковы волас і капля менструальнай крыві, якія Сурмэна парадзіла дадаць у цеста для пірагоў, з'яўляюцца сімваламі цялеснасці і прывабнасці. Прыварот Катаржына Тучкава характарызуе, як цалкам удалы і зноў не звяртаецца да рацыянальных тлумачэнняў здарэння, пакідаючы развагі чытачу, што надае эпізоду аўру таямнічасці.

Беламагічныя прыродныя практыкі, якімі карыстаюцца багіні ў рамане, моцна знітаваныя з надвор'ем. Найбольш цікавым для нас з'яўляецца такая магічная практыка, як «закляцце навальніц», пра якую мы падрабязна расказалі ў першым параграфе. У рамане «заклінаннем буры» займаецца Сурмэна, і ў дадзеным выпадку Катаржына Тучкава абапіраецца на фактаграфічныя звесткі: багіня з мянушкай Сурмэна сапраўды была знакамітая тым, што ўмела пакараць надвор'е. Тэхніка багавання апісваецца аўтаркай як нешта падобнае да рытуальнага танца. Замест заклінання Сурмэна ўжывае пэўным чынам змененаю малітву, з якой звяртаецца да Бога, просячы суцішыць буру. Апісваючы закляцце навальніцы, Катаржына Тучкава звяртае ўвагу на пэўную эстэтыку багавання як акта еднасці чалавека і стыхіі: багіня паказаная як моцная, упэўненая ў сваім поспеху асоба: тут зноў прасочваецца думка аб тым, што вядзьмарства і шарлатанства для Катаржыны Тучкавай вельмі далёкія адно ад аднаго паняцці, і багаванне непарыўна звязане з верай у свае здольнасці змяняць рэчаіснасць.

Акрамя таго, пісьменніца разглядае багаванне як лёсы рэальных жанчын, малюе вобразы багінь, дасканальна даследаваушы іх біяграфіі, але не застаючыся ў межах дакументалістыкі. Для Катаржыны Тучкавай важна паказаць сваіх гераінь менавіта як чараўніц, пранікнуць у сутнасць іх глыбіннай ідэнтычнасці. Пры гэтым у творы прысутнічаюць як вобразы вядзьмарак, якія сапраўды існавалі (часам пад зменеными іменамі і мянушкамі), так і цалкам створаныя аўтаркай персанажы.

Такім чынам, у рамане Катаржыны Тучкавай «Жыткаўскія багіні» з’ява багавання ўвасоблена на ўсіх узроўнях і з’яўляецца важнай часткай мастацкага свету твора. Можна сцвярджаць, што нават нягледзячы на фіктыўныя эпізоды і асоб, кніга застаецца праўдзівай гісторыяй жыткаўскіх багінь, асвятляючы з’яву багавання з усіх бакоў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Jílik J.* Žitkovské čarování – e-kniha. Copyright Albatros Media a. s., 2021.
2. *Hloušková L.* Spisovatelka Kateřina Tučková: Zlomily to bohyně. URL: https://www.novinky.cz/zena/styl/clanek/spisovatelka-katerina-tuckova-zlomily-to-bohyne-287816 (дата звароту: 03.09.2021).
3. *Тучкава К.* Жыткаўскія багіні : раман ; пер. з чэшск. Святланы Рогач. Вільня : Логвінаў, 2016.
4. Славянская мифология. Энциклопедический словарь. 2-е изд. Москва : Междунар. Отношения, 2002.
5. *Любенко Р.* Чудотворные растения: некоторые славянские параллели. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/chudotvornye-rasteniya-nekotorye-slavyanskie-paralleli (дата звароту: 05.10.2021).